# СПАКОЙНА І ЎЗВАЖАНА

## АДЗІНАЯ ФОРМА

Прэзідэнт нашай краіны ў сваю чаргу вельмі ўважліва ставіцца да работы з грамадзянамі. Яго патрабаванне да Адміністрацыі Прэзідэнта і ўвогуле да дзяржструктур — выбудаваць работу са зваротамі так, каб у людзей не складвалася ўражанне, што да кіраўніка краіны немагчыма данесці тую ці іншую праблему.

На думку Прэзідэнта, тут трэба выпрацаваць нармальную форму:

— Усё цягнецца з савецкіх часоў. Нехта напісаў у Адміністрацыю Прэзідэнта або на імя Прэзідэнта, нехта скардзіцца на мясцовыя органы ўлады, а мы туды накіроўваем для разгляду гэтыя скаргі і заявы. Непатрэбны паток інфармацыі.

Раней Аляксандр Лукашэнка выказваўся накont канфліктаў улад і насельніцтва ў тым, што датычыцца беспадстаўнага ўшчыльнення жыллёвай забудовы і высякання дрэў у населеных пунктах. На думку кіраўніка краіны, улады заўсёды павінны ведаць, як адрэагуе насельніцтва на тое ці іншае іх рашэнне.

— А то хутка адзеравянеем, як у асобных нашых суседзяў: улада сама па сабе, а людзі — самі па сабе, — аргументаваў Прэзідэнт.

## САЦЫЯЛЬНАЯ СКІРАВАНАСЦЬ

У Канстытуцыі Беларусь заяўлена як сацыяльная дзяржава, гэтага ж прытрымліваецца і дзяржаўная палітыка ў сваіх кірунках. Напрыклад, на мінулым тыдні ў Палацы Незалежнасці абмяркоўваліся вынікі 10 месяцаў бягучага года і планы — эканамічныя — на наступны год. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, сацыяльная скіраванасць бюджэту захаваецца. Сапраўды, для людзей важныя не столькі паказчыкі ВУП (прынамсі, рэдка хто з неспецыялістаў пра гэта задумваецца), колькі тое, як палітыка, якую рэалізуюць улады, садзейнічае вырашэнню надзённых праблем. Адпаведна, для ўсёй сістэмы дзяржаўнай улады проста неабходны канал зваротнай сувязі з людзьмі. Менавіта гэта мэта, відаць, павінна выяўляць і быць ключавой для кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, памочнікаў Прэзідэнта, кіраўнікоў міністэрстваў, ведамстваў, губернатараў, старшынь райвыканкамаў падчас тых прыёмаў грамадзян, прамых тэлефонных ліній, якія яны рэгулярна праводзяць.

*Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».*



Фота БЕЛТА.

**Адказы на звароты грамадзян павінны быць вычарпальнымі, лічыць кіраўнік Апарату Савета Міністраў Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН.**

З іншага боку, важна, каб з дробнымі пытаннямі, якія не патрабуюць вялікіх фінансавых і матэрыяльных выдаткаў, людзі не імкнуліся трапіць да высокіх чыноўнікаў. Такога кшталту праблемы, як добраўпарадкаванне вуліцы або аварыйны стан дрэва і іншае, — задача перш за ўсё мясцовых улад, тых жа сельскіх Саветаў дэпутатаў, выканкамаў.

## ЧАЛАВЕЧЫ ПАДЫХОД

Яшчэ адна важная рэч: з пытаннямі, з якімі чалавек можа разабрацца самастойна, не трэба ісці ў той жа сельвыканкам, тым больш на прыём да міністра. Напрыклад, добраўпарадкаванне ўласнага жылля — задача перш за ўсё ўласнікаў. Прынамсі, жыллё ў нас у большасці сваёй прыватнае. Але ў тым выпадку, калі размова ідзе аб капітальным рамонце або аварыйным стане дома — гэта значыць, праблемах, якія чалавеку складана вырашыць самастойна, — неабходна рэакцыя ўлады. Прычым неадкладная.

Сапраўды, вельмі шмат — калі не большасць — зваротаў грамадзян традыцыйна датычацца сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Падчас рэспубліканскага семінара «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны», які праходзіў у мінулым месяцы на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, Прэзідэнт заявіў:

— Не трэба забываць, што амаль трэць апытаных грамадзян дае рабоце сістэмы ЖКГ негатыўную ацэнку. Па значнасці для насельніцтва гэтыя пытанні займаюць другое месца пасля занятасці. І пакуль у адрас сістэмы чуецца крытыка, супакойвацца рана.

Аляксандр Лукашэнка ў гэтай сувязі звярнуў увагу, што трэба выразна размежаваць для насельніцтва, што павінна ў сэнсе ЖКГ рабіць дзяржава, а што — самі людзі. Гэта звязана з тым, што ёсць скаргі, — маўляў, недзе не адрамантавалі, недзе не пафарбавалі. У той жа час многае службы ЖКГ рабіць і не павінны. Пры гэтым, дадаў Прэзідэнт, трэба мець на ўвазе, што не кожны чалавек, нават калі ён прыватызаваў жыллё, можа сам справіцца ўнутры яго з работамі. Старыя, хворыя, інваліды — гэта тыя, каму дзяржава павінна дапамагчы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
yushkevich@zviazda.by

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

# КАЛЕКТЫЎНАЕ ПІСЬМО — СХОД — КАПІТАЛЬНЫ РАМОНТ

## У Пружанскім раёне змяншаецца паток зваротаў грамадзян

**ТАК атрымалася, што Калядзіцкі сельскі Дом культуры ледзь не адзіная ў раёне ўстанова названай галіны, якая дажыла да нашых дзён без капітальнага рамонту. СДК быў узведзены яшчэ ў савецкія часы перадавым калгасам, які ўзначальваў Герой Сацыялістычнай Працы Яўген Кудзінаў. Цяпер гаспадарка называецца «Агра-Калядзічы». Дык вось, на балансе гэтага сельгаспрадпрыемства вясковая культурная ўстанова была даўжэй за ўсе іншыя. А калі ДК усё ж перадалі аддзелу культуры, грошай на рэалізацыю такіх вялікіх праектаў там не знайшлі.**

Такім чынам, Дом культуры ў Калядзічах, дзе праходзіць шмат мерапрыемстваў, куды на рэпетыцыі збіраюцца ўдзельнікі самадзейнасці, дзе працуюць дзіцячыя гурткі харэаграфіі і іншых відаў мастацтва, сустрэў 2017 год у вельмі непрывабным стане. Дах працякаў, у залах і пакоях для заняткаў сцэны былі спрэс абшарпаныя, а за санвузлы сорамна было перад людзьмі... І нельга сказаць, што кіраўніцтва раёна аб праблеме не ведала, бывалі тут раней і старшыня райвыканкама, і яго намеснікі... Але калі ў самым пачатку года прыйшло пісьмо, пад якім падпісалася ледзь не большасць жыхароў аграгарадка Калядзічы, у вёсцы прызначылі сход.

— На сход прыйшло нашмат больш людзей, чым паставіла подпісы пад зваротам, — расказала **старшыня Хараўскога сельскага Савета дэпутатаў Алёна ПСТЫГА.** — Вяскоўцы зноў выказалі сваю просьбу кіраўнікам раёна, на гэты раз не пісьмова, а вусна — у той самай глядзельнай зале, якая ўсім сваім выглядам маліла пра абнаўленне. Тады ж было прынятае рашэнне шукаць сродкі і пачынаць рамонт. Частку грошай выдзелілі з раённага бюджэту, прафінансаваць замену даху ўзялося ААТ «Агра-Калядзічы».

Зараз зроблена вельмі многа, сцвярджае кіраўнік мясцовай улады. Яшчэ ў маі на Доме культуры з'явіўся новы дах, адрамантаваны залы для заняткаў харэаграфіяй, а таксама бібліятэка, увесь друугі паверх абноўлены. Сучасны выгляд набылі санвузлы. І да 1 снежня будаўнікі абяцаюць завяршыць гэты этап рамонту. На наступны год застаюцца глядзельная зала, фасад, дзверы, некаторыя вонкавыя канструкцыі. Галоўнае, што на Дзень работніка сельскай гаспадаркі тут праводзілі канцэрт і людзі засталіся вельмі задаволеныя. «Усе лічаць, што штуршком да пачатку рамонту стала менавіта калектыўнае пісьмо», — заключыла Алёна Рыгораўна.

**Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Пружанскага райвыканкама Алена ХАТУЛЕВА** паведаміла, што за 10 месяцаў гэтага года падчас прамых ліній, выязных прыёмаў, а таксама па пошце ў райвыканкам паступіла 430 зваротаў. 92 з іх былі задаволеныя, 33 знаходзяцца ў стадыі разгляду. Па астатніх прынятыя адпаведныя рашэнні, напрыклад, у 250 выпадках заяўнікам дадзена тлумачэнне.

Алена Хатулева адзначае, што пастаянны характар маюць просьбы, якія датычацца добраўпарадкавання тэрыторый населеных пунктаў, нярэдка гаворка ідзе пра знос старых або аварыйных дрэў. Напрыклад, на прамую лінію да намесніка старшыні райвыканкама паступіла просьба знесці старое дрэва ў вёсцы Сілічы. Пры выездзе на месца спецыялісты ўпэўніліся, што дрэва пагражала пабудове, таму было прынятае рашэнне яго спілаваць. Работы выканала брыгада раённых электрасетак. На тэлефонную лінію да другога намесніка старшыні райвыканкама патэлефанавалі жыхары вёскі Юндзілы. Яны прасілі правесці ямачны рамонт участка дарогі Клепачы — Варанілавічы — Юндзілы. Гэту работу аператыўна правялі дарожнікі Пружанскага ДРБУ-140.

**Аналіз зместу зваротаў нярэдка паказвае наяўнасць тых ці іншых сацыяльна-эканамічных праблем. Напрыклад, жыллёвы фонд былых ваенных гарадкоў, якіх пад Пружанамі некалькі, таксама перыядычна патрабуе рамонтных работ. Вось і сёлета зарэгістраваны звароты з такіх гарадкоў.**

Нярэдкія і нараканні на абслугоўванне гарадскіх і вясковых шматкватэрных дамоў, якія таксама маюць немалы ўзрост. У некаторых выпадках пасля звароту ўдавалася правесці рамонт, у іншых — тлумачылі людзям, калі іх дом можа быць уключаны ў план па рамонце ў залежнасці ад фінансавання.

Апошнім часам назіраецца спад колькасці пісьмовых і вусных зваротаў, канстатуе начальнік аддзела. На яе думку, такому становішчу ў многім спрыяе сістэма работы са зваротамі, выбудаваная ў раёне. Раз на квартал на прыёмы ў вёску выязджае кожны намеснік старшыні райвыканкама. Старшыня райвыканкама Міхаіл Крэйдзіч праводзіць выязны прыём грамадзян кожны месяц. Раней кіраўнік раёна найчасцей слухаў людзей у пасёлках Ружаны, Шарашова, іншых самых буйных населеных пунктах. А калі там стаў заўважацца спад колькасці ахвотных пагутарыць са старшынёй, адрасы выязных прыёмаў сталі мяняцца.

**Работнікі аддзела вядуць пастаянны маніторынг — з якой мясцовасці назіраецца рост колькасці пісьмаў і званкоў, тую і выбіраюць для наступнага прыёму кіраўніка. І гэта дае станоўчы эфект. Дастаткова сказаць, што зваротаў у вышэйстаячыя інстанцыі з раёна ў гэтым годзе паступіла на 64 працэнты менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.**

Рэгулярна ў раёне ладзяцца прыёмы службовымі асобамі абласных і рэспубліканскіх кіруючых органаў. Не так даўно праходзіў выязны прыём начальніка галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Юрыя Крывашэева, да якога звярнуліся восем жыхароў раёна — кожны са сваім пытаннем. Напрыклад, жыхар горада прасіў выдзеліць на тэрыторыі раёна ўчастак зямлі для вядзення сялянска-фермерскай гаспадаркі, другі хацеў адрамантаваць балкон у сваёй прыватызаванай кватэры. У абодвух выпадках просьбы былі задаволеныя. Варта адзначыць, што раней названыя грамадзяне не звярталіся ні ў адну раённую інстанцыю, інакш іх праблемы былі б вырашаныя на мясцовым узроўні, паведамілі ў райвыканкаме. Але ж законнае права грамадзян — звяртацца з пытаннем да любой службовай асобы, і гэтым правам людзі карыстаюцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** yackevich@zviazda.by

*Пружанскі раён.*